Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

28 КРАСАВІКА 2018 г. СУБОТА № 81 (28697)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ДЗЕЛЯ ПРАЦВІТАННЯ РОДНАГА КРАЮ

**Паважаныя суайчыннікі!**

**Сардэчна віншую вас са Святам працы.**

**Гэты дзень адзначаны асаблівым пачуццём удзячнасці да ўсіх, чыя праца з'яўляецца асновай жыцця і працвітання роднага краю, хто аддадзены сваёй справе і ганарыцца ёю. Падкрэслівае неабходнасць і важнасць любой прафесіі.**

**Беларускі народ заўсёды імкнуўся да стварэння. Пераадольваючы выпрабаванні ў розныя гістарычныя перыяды, наша краіна станавілася мацнейшай і прыгажэйшай. У гэтым заслуга беларусаў, галоўнымі рысамі нацыянальнага характару якіх з'яўляюцца добрасумленнае стаўленне да працы, сумленнасць, справядлівасць і адданасць сваёй зямлі. Сёння мы прадаўжаем слаўныя традыцыі і перадаём іх дзецям, развіваемся і рухаемся наперад.**

**Няхай гэта свята падорыць усім нам добры настрой і веснавы росквіт творчых сіл. Няхай у сем'ях захоўваюцца мір, любоў і ўзаемаразуменне.**

**Моцнага здароўя, шчасця і новых здзяйсненняў!**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# НЕ СКУПІЦЦА НА ПАТРЭБНАЕ ЛЮДЗЯМ

**Ужо склалася пэўная традыцыя: штогод у тыя дні, калі мы згадваем гадавіну катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, кіраўнік дзяржавы здзяйсняе рабочую паездку ў пацярпелыя ад яе раёны. У гэтым годзе была абрана Гомельская вобласць, Жыткавіцкі раён.**



Фота БелТА.

Першае, з чым азнаёміўся Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, — тое, як арганізавана пераправа цераз раку Прыпяць, у якім тэхнічным стане зараз знаходзіцца аварыйны мост і якія ёсць праекты яго рэканструкцыі. На сёння на пераправе працуе паром і пантонны мост. Паром у асноўным задзейнічаны на транспарціроўцы цяжкага транспарту вагой больш за 20 тон, а астатнія аўтамабілі прапускаюцца па пантоннай пераправе.

Кіраўнік дзяржавы даручыў да восені закончыць будаўніцтва моста. Ужо распрацаваны архітэктурны праект яго аднаўлення, які прайшоў дзяржаўную экалагічную і будаўнічую экспертызы. Кошт рэканструкцыі складзе каля 49 мільёнаў рублёў. Прытым калі цяперашні мост выкананы ў жалезабетоне, то новы пралёт, які вырабіць адзін з самых вядомых у Расіі мостабудаўнікоў «Варонежстальмост», будзе з металу.

«Калі важнасць гэтага моста высокая, значыць, мост трэба рабіць добры. Тут нам шкадаваць грошай нельга. Пашкадуем мільён-другі і атрымаем ці то вузкі, ці то яшчэ штосьці... Таму трэба рабіць капітальны моцны мост. І па шырыні дастатковы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандру Лукашэнку таксама далажылі, што, акрамя аварыйнага моста цераз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне, у краіне ёсць чатыры ідэнтычныя масты і яшчэ прыкладна дваццаць падобных. «Мы з вамі дамовіліся: гэты мост у Жыткавіцкім раёне мы павінны здаць да Дня Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як у нас прынята — падарунак народу трэба. Усе работы неабходна выканаць, — адзначыў Прэзідэнт. — І другі момант, што датычыцца перспектывы, вы даследуеце астатнія падобныя масты і ўносіце прапановы па чарговасці іх ці замены, ці рэканструкцыі. Наступны мост — гэта гомельскі. Стаўце задачу, каб гэты завод пачаў выраб гомельскага моста».

Пасля Аляксандр Лукашэнка наведаў Тураўскі малочны камбінат — станоўчы прыклад таго, наколькі паспяховым можа быць прадпрыемства па перапрацоўцы малака. Па-першае, амаль 80 % вырабленай на ім прадукцыі пастаўляецца на экспарт. Па-другое, рэнтабельнасць продажаў павялічваецца год ад году: з 4,9 % у 2015-м да 20,3 % па выніках мінулага. Па-трэцяе, камбінат стаў горадаўтваральным прадпрыемствам і фарміруе 82 % экспарту Жыткавіцкага раёна. Ды і ўвогуле бізнес-мадэль вытворчасці паказала найбольшую дабаўленую вартасць на адзінку спажытай сыравіны сярод усіх прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у холдынг «Гомельская мяса-малочная кампанія».

У 2013 годзе Прэзідэнт наведаў вытворчасць упершыню, калі яна толькі пачала сваю работу пасля ўвядзення. Па словах Вольгі Луцко, дырэктара Тураўскага малочнага камбіната, на той момант у суткі перапрацоўвалася 60 тон малака пры магутнасці першай чаргі будаўніцтва на 250 тон. «З таго часу шмат што змянілася. Другі раз мы сустракаем кіраўніка дзяржавы, а перапрацоўваем ужо 400 тон у суткі. У партфелі прадпрыемства зараз 12 экспартных рынкаў: Расія, Казахстан, Сінгапур, Іарданія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, пачаліся пастаўкі і ў Кітай... У гэтым годзе запусцім і другую вытворчую чаргу, што дазволіць павялічыць прыёмку і перапрацоўку малака да 750 тон у суткі», — расказвае кіраўнік камбіната.

І калі першая чарга будаўніцтва была арыентавана на рознічны продаж, то другая — для паставак для атэльнага, рэстараннага бізнесу. Гэта будзе ўсё тая ж італьянская група сыроў, але ўжо больш сучасная і дасканалая тэхналогія іх вырабу, а таксама іншы варыянт фасоўкі, удакладніла Вольга Луцко.

**Вераніка ПУСТАВІТ,**
*г. Тураў.*

# Першая вясна



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Кацярына ЯФІМЧЫК з дачкой Вольгай.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Медыкі ў гутарцы з бацькамі павінны прыводзіць пераканаўчыя аргументы на карысць вакцынацыі. Бацькі не заўсёды чуюць доводы спецыялістаў, калі прымаюць рашэнне адмовіцца ад прышчэпкі дзіцяці. Да таго ж не кожны з бацькоў ведае пра свой прышчэпачны статус, каб пры неабходнасці зрабіць прышчэпку і такім чынам пазбегнуць пагрозы захварэць. З-за актыўнай міграцыі насельніцтва ўзрастаюць рызыкі падхапіць вірус. Мы сёння актыўна падарожнічаем, і чалавек, вядома, сустракаецца з інфекцыйнымі захворваннямі, у тым ліку і небяспечнымі».*

■ Рынак працы

# АД САДОЎНІКА ДА ІНЖЫНЕРА

## Якую работу прапаноўвалі на сталічным кірмашы вакансій

**Мінчанін Дзмітрый два гады таму скончыў будаўнічы ліцэй. «Па спецыяльнасці я — маляр-плітачнік, але ў мяне разрад невысокі — трэці. Каб нармальны заробак мець, патрэбны чацвёрты-пяты. Таму хачу пайсці на работу з навучаннем. 600—700 рублёў у месяц атрымліваць для пачатку нядрэнна было б», — дзеліцца 23-гадовы хлопец. Якую работу шукаюць мінчане і што наймальнікі гатовы ім прапанаваць, мы даведаліся на Агульнагарадскім кірмашы вакансій. Удзел у ім прынялі больш за 100 арганізацый.**

### «Згодна пайсці і прыбіральшчыцай»

Сяброўкі Кацярына і Настасся па адукацыі — будаўнікі. Але на кірмашы прыглядаюцца да вакансій зусім у іншых сферах. Бо, па іх словах, годных прапаноў па спецыяльнасці няма, дый душа ўжо не ляжыць да будоўлі.

— Мяне цікавіць справаводства, што-небудзь з паперкамі. Хачу дзявочую работу, — усміхаецца Кацярына.

— Я пайшла б настаўніцай пачатковых класаў, — прызнаецца Настасся. — Мне падабаецца работа з дзецьмі. Маляваць, ляпіць з пластыліну... Магу па сто разоў тлумачыць, калі нешта ім незразумела. Цікава было б яшчэ працаваць рукамі. На «Галантэю», напрыклад, зборшчык дэталяў патрэбны. Разглядаю пяцідзёнку, каб субота і нядзеля паўнацэннымі выхаднымі былі. І каб працоўны дзень да 18.00, бо дзіця з садка забіраць трэба.

Што да чаканняў па заробку, то Кацярына шукае варыянты ад 600 рублёў. Для Настассі ж грошы — не самы галоўны крытэрый. «У мяне муж зарабляе, — смяецца. — А я шукаю работу для душы».

Брунетцы Надзеі — гадоў 40. Працу не можа знайсці з-за сваёй інваліднасці — у жанчыны II група, хворыя ногі. Раней была памочнікам выхавальніка ў дзіцячым садку, аператарам кацельнай, білецёрам. Цяпер згодна і на вакансію прыбіральшчыцы ў цырульні — адзінае, што ёй пакуль прапанавалі на кірмашы. Хоць, уздыхае, з задавальненнем пайшла б на сядзячую работу. «З групай інваліднасці складана ўладкавацца, — дзеліцца. — Мне можна працаваць толькі сем гадзін у дзень, а ўсе хочуць, каб работнік выходзіў на 12—13 гадзін».

Адзін з мужчын, што рабіў паметкі ў нататніку, аказаўся выкладчыкам Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі. «Вывучаю вакансіі для інжынераў-праграмістаў, каб сваім студэнтам потым расказаць, — тлумачыць. — Няма чым іх парадаваць: заробкі для выпускнікоў без вопыту — 400—500 рублёў. А яны ж усюды чытаюць, што праграмісты па тысячы долараў зарабляюць».

Увогуле на кірмашы было прыкметна менш наведвальнікаў, чым звычайна. «Па-першае, многія на лецішча з'ехалі, — выказвае свае здагадкі адзін з кадравікоў. — Па-другое, хто змог, адправіўся на заробкі за мяжу».

**Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ** лічыць, што прычына — у паляпшэнні сітуацыі на рынку і актыўнай дзейнасці службы занятасці:

— Мы кожны тыдзень праводзім міні-кірмашы вакансій, куды за раз запрашаем тры-чатыры арганізацыі. Ладзім сустрэчы з наймальнікамі і на тэрыторыі прадпрыемстваў. Таму тым, хто хацеў знайсці работу, былі дадзены ўсе магчымасці.

### Недахоп фельчараў, прадаўцоў і пакаёвак

Вывучаем вакансіі. Працоўных рук не хапае, напрыклад, у гасцініцах. «Прэзідэнт-атэлю» вельмі патрэбны пакаёўкі (заробак ад 500 рублёў). А яшчэ інструктар у трэнажорную залу, дворнік, насільшчык. Абавязкі апошняга — дапамагаць турыстам несці чамаданы да нумара. «Гасцініца пяцізоркавая, адпаведна, сэрвіс мусіць быць на ўзроўні», — адзначаюць.

Шмат прапаноў у сферы гандлю. У ЦУМ набіраюць прадаўцоў (абяцаюць 700 рублёў у месяц), прыёмшчыкаў тавараў і афіцыянтаў (і там, і там па 600 рублёў). Работнікі патрэбны таксама ў Белсаюздрук — калі працаваць за прылаўкам павільёна, можна разлічваць на 700—800 рублёў.

— У нас дзве змены — з 7.00 да 13.30 і з 13.30 да 20.00, — паведамляе пра дэталі прадстаўніца прадпрыемства. — Асабліва зручна для маладых мам, бо застаецца час на іншыя справы, напрыклад у паліклініку схадзіць. Ёсць перспектыва кар'ернага росту. З сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыяй можна стаць арганізатарам рознічнага гандлю і ўзначаліць цэлы раён — гэта 30—40 аб'ектаў.

У дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці № 97 шукаюць выхавальніка і музычнага кіраўніка. Занятасць — шэсць гадзін у дзень, заробак — да 400 рублёў. «Разлічваем на маладых, педагогаў-пачаткоўцаў», — прызнаюцца тут.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### АДБЫЛАСЯ ГІСТАРЫЧНАЯ СУСТРЭЧА ЛІДАРАЎ КНДР І ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ



Кім Чэн Ын стаў першым паўночнакарэйскім лідарам, які перасек паўднёвую мяжу КНДР з заканчэння вайны ў 1953 годзе. У вёсцы Пханмунджом, размешчанай у дэмілітарызаванай зоне, адбыліся яго перагаворы з прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Інам. Гэта першая сустрэча паміж кіраўнікамі дзвюх Карэй з 2007 года. Цяперашняя сустрэча асабліва важная з улікам заяўленай КНДР ініцыятывы па прымірэнні з Поўднем і запланаваных перагавораў Кіма з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам. Лідар КНДР Кім Чэн Ын з Мун Чжэ Інам падпісалі сумесную дэкларацыю і дамовіліся рухацца ў бок поўнай дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава. Дэкларацыя ўключае ў сябе абяцанні працягнуць скарачэнне ўзбраенняў, спыніць варожыя дзеянні, ператварыць умацаваную мяжу ў зону міру і пачаць шматбаковыя перагаворы з іншымі краінамі дзеля заключэння пагаднення аб заканчэнні Карэйскай вайны.

### У НІКАРАГУА ПАДЧАС ПРАТЭСТАЎ ЗАГІНУЛА БОЛЬШ ЗА 60 ЧАЛАВЕК

У Нікарагуа ў выніку масавых акцый і сутыкненняў пратэстоўцаў з вартавымі парадку, якія доўжыліся некалькі дзён, загінула па меншай меры 63 чалавекі. Яшчэ 15 мясцовых жыхароў зніклі без вестак. Пра гэта паведаміла ABC News. Паводле даных Пастаяннай камісіі па правах чалавека, 160 чалавек атрымалі агнястрэльныя раненні ў выніку беспарадкаў. Пратэсты ў Нікарагуа пачаліся 18 красавіка. Перад гэтым урад ухваліў законапраект, які павялічвае пенсійныя ўзносы работнікаў і работадаўцаў сумарна на пяць працэнтаў. Прэзідэнт прапанаваў мітынгоўцам правесці перагаворы, аднак тыя адмовіліся. Сілавікі спрабавалі падавіць хвалю выступленняў, разганяючы пратэстоўцаў. Выступленні суправаджаліся падпаламі будынкаў, а студэнты Політэхнічнага ўніверсітэта ў Манагуа забарыкадаваліся ў кампусе. У выніку 22 красавіка прэзідэнт Нікарагуа прыняў рашэнне адмовіцца ад пенсійнай рэформы.

ISSN 1990 - 763X

18081

9 771990 763008

### ГУРТ ABBA ЎПЕРШЫНЮ ЗА 35 ГАДОЎ ЗАПІСАЎ ДЗВЕ НОВЫЯ ПЕСНІ



Аб гэтым паведамляецца ў афіцыйным запісе квартэта ў «Інстаграме». «Мы ўсе ўчатырох адчулі, што праз 35 гадоў магло б быць цікава зноў аб'яднаць намаганні і адправіцца ў студыю гуказапісу. Так мы і зрабілі», — гаворыцца ў публікацыі. Па словах музыкантаў, у працэсе працы яны адчулі, што «час быццам спыніўся», а 35 гадоў перапынку былі толькі «кароткім адпачынкам». «Магчыма, мы пастарэлі, але песня — новая. І гэта добра!» — лічаць артысты. Адзначаецца, што адну з кампазіцый у снежні выканае лічбавая копія квартэта ў адной з тэлевізійных праграм.

Дарэчы, гурт ABBA быў утвораны ў 1972-м. Праз дзесяць гадоў квартэт распаўся. За гэты час артысты сталі адным з найбольш папулярных поп-гуртоў у гісторыі. У 2010-м ABBA была ўключана ў Залу Славы рок-н-рола. Восенню 2017 года гурт анансаваў сусветнае турнэ, у якое адправіліся лічбавыя копіі музыкаў.

## КОРАТКА

**У Беларусі зменяць нормы выдачы спецвопраткі людзям, якія заняты на ўборцы ўраджаю. ФПБ звярнулася ў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання з ініцыятывай памяняць нормы ў гэтай сферы. Сумесна з «Беллегпрамам» ужо падабралі ўзоры спецадзення і абутку, якія дазволяць камфортна працаваць у спякоту.**

Машыны ДАІ з прыборамі фотафіксацыі парушэнняў паркоўкі пачалі працаваць у Мінску. Яны аўтаматычна фіксуюць парушэнні правілаў спынення і стаянкі. Па аналогіі з фотафіксацыяй парушэнняў хуткаснага рэжыму да адказнасці прыцягваецца ўласнік транспартнага сродку, таксама будуць накіроўвацца лісты са штрафамі.

**У Беларусі з удзелам кітайскіх партнёраў пабудуюць завод па вытворчасці новага віду мінеральных угнаенняў — нітрату калію.**

# АД 47 ДА 165 РУБЛЁЎ У СУТКІ

## Колькі грошай спатрэбіцца для адпачынку ў беларускім санаторыі гэтым летам?

**Адпачынак у беларускіх санаторыях робіцца ўсё менш падобным на савецкі: тры разы на дзень шведскі стол, замежнае медыцынскае абсталяванне і набор сучасных аздараўленчых працэдур, у тым ліку SPA, маляўнічыя краявіды, добраўпарадкаваныя пляжы і сасновы лес, басейны і тэнісныя корты... Але разам з сэрвісам і цэны імкнуцца да еўрапейскіх, што, праўда, пакуль не спалохала ні беларусаў, ні замежных гасцей. Таму, калі вырашылі адпачыць у Беларусі, паспяшайцеся: 75—95 % пуцёвак на лета ў санаторыі ўжо выкуплены.**

Безумоўна, гарачая пара для беларускіх здраўніц — лета, час масавых адпачынкаў і школьных канікул. У цёплыя дні і санаторыі здаюцца найбольш прывабнымі: не сакрэт, што купацца ў возеры і загараць госці могуць на працягу толькі двух-трох летніх месяцаў, і то пры спрыяльным надвор'і. Але і ў астатні час санаторна-курортныя комплексы не пустуюць. У першым квартале гэтага года, паводле інфармацыі дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзя Балбатоўскага, яны былі запоўнены ў сярэднім больш чым на 70 % — і гэта лічба застаецца стабільнай.

### Па кошце і сэрвіс

Сёлета да паслуг беларусаў і замежных гасцей 106 санаторыяў — з розным цэннікам і на розны густ. Адначасова яны гатовы прыняць 28,5 тысячы адпачывальнікаў. Сярэдні кошт пуцёўкі з пражываннем у стандартным двухмесным нумары ў першым квартале складаў 52 рублі ў суткі. Улічваючы, што для аздараўлення трэба прайсці курс ў 10—14 дзён, пуцёўка абыходзілася ў сярэднім у 520—730 рублёў. У сезон разам з павышэннем попыту растуць і цэны — да 57 рублёў у суткі за стандартны двухмесны нумар.

Зрэшты, кошты на беларускія санаторыі сёння вельмі розняцца. Ёсць нумары ў старых карпусах, пра якія адпачывальнікаў адразу папярэджваюць: «без рамонту». Да іх пакуль не дайшлі час і грошы. Але выглядаюць яны цалкам гарманічна ў комплексе з выявай Леніна на пастаменце (куды ж без яго, калі санаторый пабудаваны ў 30-х гадах мінулага стагоддзя), Домам культуры і сталоўкай, выгляд каторых таксама можна абазначыць як прывітанне з савецкага мінулага. І тут жа — выдатная водалячэбніца з найноўшым абсталяваннем і сучаснымі працэдурамі, а таксама карпусы, дзе рамонт ужо здзейснены, пра што сведчыць наяўнасць вялікіх аўтамабіляў з расійскімі нумарамі побач. Тыя, хто любіць такім чынам настальгіраваць, падарожжа ў мінулае могуць здзейсніць па цэнах даволі дэмакратычных — ад 45,63 рубля ў суткі ў аднапакаёвым двухмесным нумары ў красавіку да 47 рублёў у летнія месяцы.

СТАР. 2

■ Камунальныя стасункі

# МАЕШ КВАТЭРУ І НЕ ХОЧАШ ПРАЦАВАЦЬ?

## Рыхтуйся плаціць за «камуналку» па поўнай

**У наступным годзе павялічацца налічэнні за жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП) для іх плацельшчыкаў, калі яны не працуюць і жывуць адны. Па эканамічна абгрунтаваных тарыфах, якія прадугледжваюць 100-працэнтнае пакрыццё кошту затрат на аказанне паслуг ЖКГ, будуць налічваць грошы за гарачую ваду, газ і цяпло.**

### Плацельшчык беспрацоўны і працуючы

Плаціць па поўным тарыфе будуць працаздольныя грамадзяне, якія не занятыя ў эканоміцы па асабістым жаданні, з'яўляюцца плацельшчыкамі ЖКП і ўнесены ў спісы, зацверджаныя выканкамамі. Такія спісы, мяркуецца, створаць сёлета да 1 снежня. Налічваць павышаную камуналку за гарачую ваду пачнуць з 1 студзеня 2019-га, а за газ (пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў) і ацяпленне — з 1 кастрычніка 2019-га.

— Плацельшчыкамі ЖКП лічацца ўласнік, наймальнік ці арандатар жылога памяшкання, члены арганізацый-забудоўшчыкаў, чалавек, які заключыў дагавор далявога будаўніцтва, або лізінгаатрымальнік, — растлумачыла **Жанна ПАПУЧЭЕВА, начальнік аддзела ўпраўлення эканомікі Міністэрства ЖКГ Беларусі.**

Калі плацельшчык ЖКП — член сям'і працаздольнага чалавека, які не жадае працаваць, то камуналка будзе налічвацца як звычайна, без прымянення эканамічна абгрунтаваных тарыфаў, дадала яна. Такім чынам, на беспрацоўнага, які жыве ў кватэры, дзе плацельшчыкам з'яўляецца іншы чалавек, павышаныя тарыфы не распаўсюджваюцца.

Калі разам жывуць непрацуючы плацельшчык ЖКП і яшчэ адзін працаздольны беспрацоўны і яны ўнесеныя ў спісы, то на абодвух камуналка будзе налічвацца па поўных тарыфах.

### Гігакалорыі падзеляць на колькасць жыльцоў

— Плата за гарачую ваду будзе налічвацца зыходзячы з кошту яе падагрэву. Ён разлічваецца з кошту тарыфу на цеплаэнергію для патрэб ацяплення і колькасці цеплаэнергіі, якая спатрэбілася на падагрэў вады, скарыстанай грамадзянамі, — акрэсліла спецыяліст.

Напрыклад, у жыллі, дзе зарэгістравана тры чалавекі, на падагрэў вады было затрачана 0,6 Гкал, а плацельшчык ЖКП — працаздольны беспрацоўны, які не знаходзіцца на ўліку ў службе занятасці. У такім выпадку колькасць энергіі (0,6 Гкал) дзеляць на колькасць жыльцоў (тры чалавекі). Атрымліваецца, 0,2 Гкал — колькасць энергіі, якая, як лічыцца, пайшла на падагрэў вады, ужытай беспрацоўным. Менавіта на такі аб'ём грошы будуць налічаны ў поўным аб'ёме. На астатнія 0,4 Гкал — па звычайным субсідаваным тарыфе. Плата за ваду ў двухпакаёвай кватэры плошчай 48 м² з трыма жыхарамі, дзе ўласнік — беспрацоўны, такім чынам, павялічыцца на 5-6 рублёў (калі ваду будуць ужываць у межах устаноўленых нормаў).

Калі непрацуючы ўласнік кватэры жыве ў ёй адзін, то за ўсю гарачую ваду ён заплаціць па поўнай. Калі ў жыллі зарэгістравана тры чалавекі і плацельшчык ЖКП (уласнік) — член сям'і беспрацоўнага, то плата за камуналку будзе налічвацца як звычайна.

### Плата за цяпло і газ з лічыльнікам і без

— Расход энергіі на ацяпленне залежыць ад плошчы жылля. І налічэнне платы за цеплазабеспячэнне ў памяшканні, якое абсталявана індывідуальным газавым ацяпляльным прыборам і дзе не ўстаноўлены прыбор уліку расходу газу, будзе рабіцца зыходзячы з колькасці газу, які быў выкарыстаны на ацяпленне памяшкання, што прыходзіцца на долю чалавека, які не працуе, — растлумачыла прадстаўніца Мінжылкамгаса.

Напрыклад, на ацяпленне двухпакаёўкі ў 48 м² з трыма зарэгістраванымі, дзе плацельшчык — беспрацоўны, зрасходавана 1,2 Гкал. Пры налічэнні платы за ацяпленне колькасць энергіі (1,2 Гкал) падзеляць на колькасць жыльцоў (тры чалавекі). Атрымліваецца 0,4 Гкал на чалавека. Такім чынам, плату па поўным тарыфе налічаць за 0,4 Гкал, а на астатнія 0,8 Гкал — па звычайным. Кошт за ацяпленне такой кватэры ў гэтым выпадку падымецца на 15 рублёў, а калі беспрацоўны ўласнік жыве адзін, то — прыкладна на 60.

Калі памяшканне абсталявана газавым ацяпляльным прыборам і прыборам уліку расходу газу, то плату за ўжыты рэсурс налічаць зыходзячы з паказчыкаў лічыльніка. Гэтыя лічбы падзеляць на колькасць зарэгістраваных. Аб'ём, што прыйдзецца на беспрацоўнага, неабходна будзе аплачваць па эканамічна абгрунтаваным тарыфе.

Напрыклад, на абагрэў такога памяшкання, дзе зарэгістравана трое, зрасходавана 150 м³ газу. Гэтую колькасць (150 м³) падзеляць на жыхароў (тры чалавекі). Атрыманыя 50 м³ на чалавека для беспрацоўнага аплачваюцца на 100 %, астатнія 100 кубаметраў — па звычайным тарыфе. Уласнік, які не працуе і пражывае адзін, заплаціць па поўнай за ўсе 150 кубаметраў.

У кватэры з трыма жыхарамі, дзе плацельшчык ЖКП не працуе і не знаходзіцца на ўліку ў службе занятасці, аплата за газ павялічыцца прыкладна на 15—16 рублёў. У кватэры, дзе ўласнік не працуе і жыве адзін, кошт за газ падымецца амаль на 40 рублёў.

— У кожнага грамадзяніна, які сёння не заняты ў эканоміцы, ёсць рэальная магчымасць змяніць свой статус. У тым ліку і праз зварот у службу занятасці ці легалізавацца, калі чалавек заняты ў ценявой эканоміцы. Часу да пачатку дзеяння тарыфаў дастаткова, — падкрэсліў **Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Ён дадаў, што асноўная мэта Дэкрэта № 1, падпісанага Прэзідэнтам 25 студзеня, — дапамагчы працаўладкавацца ўсім, хто хоча, а не ўзяць грошы з людзей.

**Ірына СІДАРОК**

**Даведка «Звязды»**

**На беспрацоўных плацельшчыкаў ЖКП, якія зарэгістраваны ў службе занятасці, дзеянне Дэкрэта № 1 распаўсюджвацца не будзе. Нагадаем, што знаходзіцца на ўліку беспрацоўных можна не больш за 18 месяцаў. Калі за гэты час чалавек двойчы адмаўляецца ад прапанаванага месца працы або двойчы не пагаджаецца на курсы перакваліфікацыі, з уліку яго здымаюць. Зарэгістравацца зноў у якасці беспрацоўнага ён зможа толькі праз год.**

# АД САДОЎНІКА ДА ІНЖЫНЕРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Недахоп кадраў традыцыйна застаецца ў ахове здароўя. Вось Гарадская станцыя хуткай медыцынскай дапамогі запрашае фельчараў (прапануюць ад 600 рублёў у месяц) і ўрачоў (ад 750 рублёў). Кажуць, сёння медыкі да іх падыходзілі, цікавіліся вакансіямі. У аднаго мужчыны, праўда, доўгі перапынак у рабоце быў, больш за чатыры гады, — яму давядзецца пацвердзіць дыплом і здаць экзамен. У Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр неабходны масажыст, траўматолаг-артапед, рэабілітолаг, інструктар-метадыст па фізкультурна-аздараўленчай рабоце.

### Патрэбны кандыдаты з вопытам

У прамысловасці маюць патрэбу ў кваліфікаваных кадрах. На «Амкадор-Белвар» гатовы ўладкаваць інжынераў-канструктараў, інжынераў-тэхнолагаў, токараў, наладчыкаў станкоў і маніпулятараў. Заробкі — ад 650 да 1100 рублёў. Цясляр, страхар па рулонных стрэхах, машыніст кампрэсарных установак, апаратчык электролізу неабходныя на «Інтэграле». Аплата залежыць ад разраду: калі з чацвёртым можна разлічваць на 550 рублёў і больш, то з шостым — мінімум на 750.

Прывабную праграму для студэнтаў апошніх курсаў і выпускнікоў прапануе завод «Кока-Кола».

— Прымаючы моладзь на работу, мы даём ім магчымасць папрацаваць у розных кірунках: і на вытворчасці, і ў аналітыцы, і ў камерцыйным аддзеле, — каб яны зразумелі, да чаго больш здольныя. Навучаем, арганізуем трэнінгі. Праз два гады выпускнік можа стаць кіраўніком, — апісваюць перавагі праграмы прадстаўнікі прадпрыемства.

На «Элеме» чакаюць швачак і... садоўніка. «У нас на тэрыторыі прадпрыемства такія ружовыя кусты! — уздыхае прадстаўніца фабрыкі. — Нам бы спатрэбілася жанчына з вопытам развядзення кветак».

Мінскі домабудаўнічы камбінат набірае слесара-рамонтніка, машыніста маставога крана, маляра-штукатура, мантажніка сантэхсістэм і абсталявання. Адзначаюць, што разглядаюць толькі кандыдатаў з вопытам і разрадам па прафесіі. Кадры неабходныя і прадпрыемству «Мінскметрабуд». Запрашаюць цесляроў-бетоншчыкаў, муляроў, праходчыкаў, інжынераў па якасці.

Ёсць прапановы і для кіроўцаў. Тых, у каго катэгорыя D, гатовы ўладкаваць у аўтобусны парк № 2 — на гарадскія, міжгароднія і міжнародныя маршруты. Заробак абяцаюць ад 1300 рублёў. Кіроўцаў катэгорыі E чакаюць у транспартна-лагістычным цэнтры «Белінтэртранс».

— Паглядзіце, якія ў нас прыгажуны, — паказвае спецыяліст па кадрах фота самазвалаў і кантэйнеравозаў, на якіх трэба будзе ездзіць. — Заробкі кіроўцаў — каля 700—800 рублёў. За другі клас ідзе даплата ў памеры 10 % ад акладу, за першы — 20 %.

Калі казаць пра сітуацыю ў Мінску ў цэлым, то пераважна попыт на кадры фарміруюць арганізацыі будаўніцтва (19,5 %), прамысловасці (15,6 %), аховы здароўя і аказання сацыяльных паслуг (12,6 %), гандлю (10,9 %), адукацыі (7,3 %). Удзельная вага вакансій па рабочых прафесіях складае 55,3 %.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

❍ У тэму

## НА КОЖНАГА — ШЭСЦЬ ВАКАНСІЙ

**На 1 красавіка ў Мінску было адкрыта больш за 12 тысяч вакансій. У параўнанні з папярэднім годам попыт на работнікаў вырас амаль на 40 %. Патрэба ёсць як у спецыялістах, так і ў прадстаўніках рабочых спецыяльнасцяў — знайсці працу сваёй мары могуць уладальнікі навыкаў па 900 розных кірунках.**

Але нават калі вам здаецца, што з вашай спецыяльнасцю знайсці працу ва ўмовах сучаснага свету немагчыма, то гэта яшчэ не падстава адчайвацца. Служба занятасці прапануе беспрацоўным прайсці курсы перападрыхтоўкі. Самі яны бясплатныя, да таго ж падчас навучання слухачы атрымліваюць стыпендыю. Так, мінчан у мінулым годзе ўскалыхнула інфармацыя аб тым, што набіраюць групу для навучання на кіроўцаў электрацягніка і слесараў па рамонце рухомага саставу. Прычым зарплата — ад 1,5 тысячы рублёў. Зараз навучанне можна прайсці па некалькіх дзясятках напрамкаў, напрыклад, кіроўца пагрузчыка, дарожны рабочы, спецыяліст па закупках.

Акрамя таго, тым, хто не проста хоча знайсці працу, а гатовы адкрыць свой бізнес, каб у будучыні даць шанц працаўладкавацца і іншым, выдзяляюцца бязвыплатныя субсідыі. З пачатку года падтрымкай ужо скарысталіся 30 мінчан, плануецца, што да канца снежня такім чынам пачнуць свой бізнес 170 чалавек. Памер субсідыі — 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму, што роўна прыкладна 2,2 тысячы рублёў.

— Вельмі прыемна, калі людзі, якія восем гадоў таму адкрывалі свой бізнес як беспрацоўныя пры падтрымцы службы занятасці, зараз выстаўляюць вакансіі для сваёй ужо паспяховай справы, — адзначыла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.**

Што датычыцца наёмных работнікаў, то ў прыярытэце кваліфікаваныя кадры. Запатрабаваныя муляры, арматуршчыкі, кіроўцы, кантралёры-касіры, маляры, мантажнікі будаўнічых канструкцый, цесляры-бетоншчыкі, кухары, швачкі. Сярод спецыялістаў — гэта ўрачы, бухгалтары, выхавальнікі, кіраўнікі сярэдняга звяна, менеджары, фармацэўты, выкладчыкі-перакладчыкі. Самая вялікая канкурэнцыя сярод прэтэндэнтаў назіраецца на прафесіі некваліфікаванай працы, напрыклад, вартаўнікоў, вахцёраў, прыбіральшчыкаў, сартавальнікаў, укладчыкаў-пакавальнікаў і гэтак далей. Сярэдняя велічыня заработнай платы па вакансіях, прадстаўленых на біржы, — каля 600 рублёў. З пачатку гэтага года былі працаўладкаваны пры падтрымцы органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне каля 1,5 тысячы чалавек. Тэрмін пошуку працы ў іх склаў у сярэднім каля трох месяцаў.

**Дар'я КАСКО.**

■ Жыллё

# У чаканні сваёй чаргі

## Мінбудархітэктуры дапускае, што пасля атрымання арэнднага жылля за шматдзетнымі чарга захаваецца

**Прэзідэнт краіны, выступаючы са штогадовым пасланнем да народа і парламента, адзначыў, што трэба ўсебакова вывучыць пытанне аб захаванні чаргі на жыллё для тых, хто атрымаў арэндную кватэру. У адказ Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва прапанавала захаваць для шматдзетных сем'яў, якія атрымалі арэнднае жыллё, чарговасць у спісе грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, перадае БелТА.**

Міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Чорны прапануе Міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі сумесна з зацікаўленымі структурамі прапрацаваць гэтае пытанне. Такім чынам можа быць знята праблема, якая датычыцца выканання дзейнай нормы аб паляпшэнні жыллёвых умоў шматдзетнымі сем'ямі на працягу года пасля атрымання сям'ёй статусу шматдзетнай. «У выпадку калі шматдзетнай сям'і на працягу года будзе выдзелена арэнднае жыллё, яна можа там пражываць і чакаць сваёй чаргі на будаўніцтва ўласнага жылля», — адзначыў міністр.

Варта заўважыць, што ў Мінску сем'і, у якіх чацвёра і больш непаўналетніх дзяцей, знаходзяцца ў чарзе тых, хто мае патрэбу, у сярэднім два гады. Згодна з дзейным заканадаўствам, грамадзяне, якія ўсяліліся ў арэнднае жыллё, здымаюцца з уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і фактычна, прастаяўшы доўгія гады ў чарзе, каб пабудаваць уласнае жыллё, такое права губляюць.

**Сяргей КУРКАЧ**

# АД 47 ДА 165 РУБЛЁЎ У СУТКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напрыклад, той жа санаторый «Лётцы» ў Віцебскім раёне — сёння адзін з самых папулярных сярод даступных па бюджэце. Пагодзімся: не ўсім важны дызайн нумара, куды прывабнейшы хваёвы лес, дзе і знаходзіцца санаторый, і прыгожае возера Шэвіна, да якога рукой падаць, і дзе можна не толькі пакупацца, але і пакатацца на лодках і катамаранах і парыбачыць. Дагледжаны пляж, як і навакольная тэрыторыя, якія супрацоўнікі санаторыя штогод з любоўю рыхтуюць да новага сезона, дадаюцца.

А дзе ж абяцаны трохразовы шведскі стол? Спяшаемся перайсці да цалкам еўрапейскага сэрвісу і сардэчна запрашаем у санаторый «Пліса». Тая ж Віцебская вобласць, Гарадоцкі раён. З першага погляду відавочна, што тут стараліся ўвасобіць сучасныя тэндэнцыі ў санаторна-курортным аздараўленні. Цалкам новыя карпусы (санаторый пабудаваны ў 2016-м, запрацаваў на поўную магутнасць толькі летась), нямецкае медыцынскае абсталяванне, натуральныя матэрыялы ў апрацоўцы нумароў (дрэва і лён) і раскошны дызайн у выключна светлых колерах, шведскі стол на снядана, абед і вячэру, самі стравы дыетычныя і здаровыя. Басейн, сауны і лазні, тэнісныя корты і спартыўныя пляцоўкі для футбола, баскетбола і валейбола... Ну і мясцовая «гразь без адрыву ад экаасяроддзя» — што значыць свежая, лячэбная і карысная, а таксама мінеральная вада. А за акном так вабіць найпрыгажэйшае возера Пліса з пляжам, на якім зрабілі драўляны насціл з шэзлонгамі і парасонамі. Застаецца толькі падключыцца да Wi-Fi і, зручна ўладкаваўшыся, чытаць або расслабіцца і марыць... Пражыванне ў двухмесным нумары ў такім санаторным раі абыдзецца ў 165 рублёў у суткі, а ў трохпакаёвых апартаментах — у 360 рублёў. Дарэчы, у будаўніцтва самога санаторна-курортнага комплексу, паводле прызнання яго ўласніка, укладзена больш за 16 мільёнаў долараў.

— Усе нашы санаторна-курортныя ўстановы — небюджэтныя і працуюць у рынкавых умовах, — каментуе Генадзь Балбатоўскі. — Таму яны вымушаны паляпшаць і ўзмацняць матэрыяльна-тэхнічную базу. У сярэднім каля чвэрці з выручаных сродкаў штогод накіроўваюць на гэтыя мэты. Прыемна, што ў нас з'яўляюцца такія новыя аб'екты, як санаторый «Пліса», які адпавядае еўрапейскім нормам і мае прыродную лячэбную базу.

Дарэчы, існуе мноства рэйтынгаў беларускіх санаторыяў. Сярод «топавых» нязменна значацца вядомыя за межамі Беларусі «Юнацтва» і «Альфа Радон», «Прыазёрны» і «Спадарожнік». Свой рэйтынг складае і Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. У яго аснове — восем паказчыкаў, па якіх вызначаецца паспяховасць установы, — у асноўным гэта эканамічныя крытэрыі. Летась пераможцам у такім рэйтынгу стала «Юнацтва» (Мінскі раён), на другім месцы — санаторый «Сосны» (Мінская вобласць, Мядзельскі раён), на трэцім — «Баравое» (Віцебская вобласць, Докшыцкі раён).

### Колькасць гасцей з замежжа расце

Летась беларускія санаторыі прадалі 525 тысяч пуцёвак. Сярод адпачывальнікаў было каля 200 тысяч замежных грамадзян. Пераважная большасць з іх — 90 % — расіяне. Але апошнім часам усё больш цікавасці да беларускага санаторна-курортнага лячэння праяўляюць жыхары іншых суседніх краін — Літвы і Латвіі, Польшчы, а таксама Германіі. На гэта ўплывае і паслабленне візавага рэжыму.

— У бязвізавай зоне Брэсцкай і Гродзенскай абласцей знаходзіцца восем санаторыяў, — кажа Генадзь Балбатоўскі. — І мы адчуваем, што попыт на іх з боку замежных грамадзян павялічваецца. Увогуле ж каля 40 % адпачывальнікаў — замежныя госці, 60 % — беларусы. Такія суадносіны склаліся даўно, і лічбы замежных грамадзян могуць вагацца ў межах 2 %. А калі ўлічваць і пуцёўкі, якія выдаткаваны тым, хто мае патрэбу ў аздараўленні за бюджэтны кошт, то частка нашых суайчыннікаў яшчэ большая.

Пра тое, што папулярнасць беларускіх санаторыяў у замежных гасцей расце, таксама сведчаць лічбы. У першым квартале гэтага года экспарт паслуг павялічыўся на 15 % і склаў больш за 35 мільёнаў рублёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПРЫВІТАННЕ, КАСТРАМА!

## Як мы супрацоўнічаем у фармаце «краіна—рэгіён»

**Поспех рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй натхніў на пашырэнне такога вопыту на іншыя краіны. Ідэі сяброўства рэгіёнамі гучаць апошнім часам на самых розных двухбаковых сустрэчах з удзелам Беларусі. Днямі ў Мінск прыязджаюць прадстаўнікі інфармацыйнай сферы Кастрамской вобласці Расійскай Федэрацыі, і гэта нагода азірнуцца і паглядзець, чым напоўнены фармат адносін «краіна — расійскі рэгіён».**

Найноўшая гісторыя супрацоўніцтва кастрамічоў і беларусаў налічвае больш за 15 гадоў. Яшчэ ў 2003-м паміж адміністрацыяй расійскай вобласці і Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам было падпісана пагадненне аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. Праз два гады аналагічны дакумент падпісаў Віцебскі абласны выканаўчы камітэт, яшчэ праз год — Магілёўскі.

Нарэшце ў лютым 2017 года ў рамках візіту дэлегацыі Кастрамской вобласці на чале з губернатарам Сяргеем Сітнікавым (падчас візіту адбыліся сустрэчы з Прэзідэнтам і прэм'ер-міністрам Беларусі) было падпісана пагадненне аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве паміж урадам Рэспублікі Беларусь і адміністрацыяй Кастрамской вобласці.

У жніўні для рэалізацыі пагаднення быў прыняты план сумесных мерапрыемстваў на найбліжэйшыя два з невялікім гады. Бакі паставілі канкрэтныя задачы ў сферы прамысловасці, будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аграпрамысловага і лесапрамысловага комплексаў. Запланавалі таксама ўмацоўваць сувязі ў сферах інфармацыі, адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры і ў выставачна-маркетынгавай дзейнасці.

Яшчэ раней, падчас IV Форуму рэгіёнаў у Маскве, быў заключаны мемарандум аб супрацоўніцтве ў галіне друку і інфарматызацыі паміж інфармацыйна-аналітычным упраўленнем Кастрамской вобласці Расійскай Федэрацыі і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Цяпер, праз год пасля падпісання пагаднення, і праз восем месяцаў пасля падпісання адпаведнага плана можна падводзіць некаторыя вынікі.

«На працягу апошніх гадоў Беларусь з'яўляецца вядучым гандлёвым партнёрам Кастрамской вобласці, — паведамляе прэс-служба адміністрацыі расійскага рэгіёна. — Па даных мытнай статыстыкі, знешнегандлёвы абарот Кастрамской вобласці з Рэспублікай Беларусь за 2017 год склаў $51,7 млн, гэта 11,8 % ад усяго аб'ёму знешнегандлёвага абароту Кастрамской вобласці (у 2016 годзе — 11,1 %)».

У 2017 годзе кастрамічы нарасцілі экспарт у нашу краіну на $2,7 млн. Адзін з найбуйнейшых рэгіёнаў Цэнтральнай федэральнай акругі Расіі пастаўляе ў Беларусь драўніну і вырабы з яе (больш за 74 % тэрыторыі рэгіёна пакрыта лясамі), машыны і абсталяванне, запасныя часткі да іх, хімічную прадукцыю.

Беларусь, у сваю чаргу, прадае харчовыя тавары і сельскагаспадарчую сыравіну, машыны і пагрузчыкі, будаўнічыя матэрыялы, тэкстыль, абутак. Летась нашай краінай было пастаўлена ў гэты рэгіён Расіі тавараў прамысловага прызначэння на $8,4 мільёна (тэмп росту склаў 140 %), мяса-малочнай прадукцыі, агародніны, ільну-сырцу — на $4,74 мільёна.

«Беларускія тавары шырока прадстаўлены ў гандлёвых сетках Кастрамской вобласці і карыстаюцца нязменным попытам у кастрамічоў дзякуючы іх высокай якасці і даступнай цане», — паведамляе інвестыцыйны партал расійскага рэгіёна.



Кампазіцыя «Кастрама» пецярбургскага гурта «Иван Купала» гучала падчас цырымоніі адкрыцця Алімпіяды 2014 года. Песня пачынаецца са слоў «Здорово, Кострома!». На фота: святочнае шэсце ў Кастраме ў Дзень горада, жнівень 2017 года. http://lifekostroma.ru

У 2017 годзе беларускія вытворцы харчовай прадукцыі, а таксама народныя майстры прынялі ўдзел у двух кастрамскіх кірмашах. Акрамя таго, мінскі Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр прапаноўваў сваю прадукцыю на кірмашы, прысвечаным Дню славянскага пісьменства. Два з гэтых кірмашоў праходзілі яшчэ да падпісання плана па рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве.

Можна казаць пра наладжванне вытворчай кааперацыі паміж беларускімі і кастрамскімі прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці. У 2017 годзе Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка выканала заказаў прадпрыемстваў расійскага рэгіёна па перапрацоўцы воўны на суму $2,5 млн, а Жлобінская швейная фабрыка — па сваім профілі на суму $327 тысяч.

Развіваецца кааперацыя паміж Мінскім маторным заводам і Кастрамскім заводам аўтакампанентаў. На працягу мінулага года былі сумесна праведзены работы па арганізацыі на кастрамскім прадпрыемстве вытворчасці поршневых кольцаў. Гэтыя дэталі беларускі завод закупляе ў кастрамічоў практычна для ўсіх мадэляў рухавікоў. Летась расійскі імпарт склаў суму каля $425 тысяч.

Перспектыўнымі кірункамі супрацоўніцтва бакі таксама называюць сельскую гаспадарку, у прыватнасці, мадэрнізацыю жывёлагадоўчай галіны, развіццё бульбаводства, пастаўкі дарожнай і сельскагаспадарчай тэхнікі.

Што датычыцца паставак беларускіх электробусаў арганізацыям кастрамской вобласці, то, нягледзячы на наведванне расійскім губернатарам «Белкамунмаша», накіраваную па выніках гэтага візіту камерцыйную прапанову з боку беларускай кампаніі, тралейбуснае ўпраўленне горада Кастрамы не запланавала куплю тралейбусаў ні на 2017-ы, ні на 2018 год.

Адным з пунктаў плана прадугледжана прапрацоўка пытання аб стварэнні на тэрыторыі расійскага рэгіёна адзінага цэнтра продажу і сэрвіснага абслугоўвання беларускай тэхнікі. Аднак і МАЗ, і «Гомсельмаш», і МТЗ палічылі стварэнне такога цэнтра пакуль немэтазгодным.

Але трэба сказаць, што работа над тымі пунктамі плана, рэалізацыя якіх у 2017—2018 гадах аказалася немагчымай, працягваецца. І канчатковыя вынікі будуць падведзеныя пасля завяршэння 2019 года.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Аты-баты

# ВОПЫТ БРЫГАДЫ

**Інсцэніроўка баявых дзеянняў з удзелам 19-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання прайшла на 230-м агульнавайсковым палігоне «Абуз-Лясноўскі». На адным навучальным полі бою салдаты каардынавалі свае дзеянні з авіяцыяй, танкавымі падраздзяленнямі і артылерыяй, каб падавіць умоўнага праціўніка.**

Мерапрыемства адбылося ў рамках паказнога тактычнага вучэння, якое было ў краіне з 23 па 27 красавіка пад кіраўніцтвам **намесніка міністра абароны генерал-маёра Сяргея ПАТАПЕНКІ.** Падчас вучэнняў кіруючы склад злучэнняў і вайсковых часцей адпрацоўвае, як арганізоўваць абарону краіны з улікам перадавога вопыту апошніх лакальных канфліктаў.

У час мерапрыемства **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ** адзначыў высокі ўзровень падрыхтоўкі беларускіх вайскоўцаў.

«Мы прывялі на вучэнні службовых асоб, якія займаюцца баявой падрыхтоўкай: ад камандзіра батальёна і да камандавання брыгад, — каб яны маглі перадаваць вопыт 19-й брыгады Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання сваім злучэнням і часцям», — расказаў Андрэй Раўкоў.

Падчас вучэбнага бою ўжываліся ўсе сілы і сродкі, якія былі ў распараджэнні камандзіра брыгады, неабходная падтрымка ў выглядзе авіяцыі, артылерыйскіх падраздзяленняў, якія прыдаюцца брыгадзе для вядзення абарончага бою пад пэўную задачу.

«Мы актыўна ўдасканальваем спосабы прымянення гэтых сіл і сродкаў з улікам тых канфліктаў, якія зараз адбываюцца ў свеце. Адзін з іх — «сірыйскі вал», які дазваляе выконваць паражэнне праціўніка танкамі да ўзвода з мінімальным паражэннем саміх танкаў. Брыгада, я лічу, добра адпрацавала свае задачы, відаць іх падрыхтоўка», — дадаў Андрэй Раўкоў.

У суботу, 28 красавіка, пачнецца завяршальны этап вучэнняў, калі будзе адбывацца пагрузка, адпраўка падраздзяленняў і тэхнікі ў месцы пастаяннай дыслакацыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

Катылы Пружанскага раёна

# «ЦЯПЕР У НАС МАНАСТЫР ЗАМЕСТ КАЛГАСА»




**Уся ўлада ў Катылах зараз у вясны. Аблітыя белым квеценем слівы і вішні, здаецца, ніколечкі не горшыя за знакамітую японскую сакуру. Заліваюцца вясновым спевам птушкі. І толькі звычайных вясковых гукаў для гэтай пары малавата. Не чуваць галасоў свойскай жывёлы. У гэтай вёсачцы, што захавалася паміж лясамі, засталося пяць сталых жыхароў. Іншыя падцягнуцца ў пару летніх водпускаў ды канікул.**



## Жаночая гісторыя

Гаспадары аднаго з утульных дагледжаных дамоў завіхаліся на агародзе. Вера Данілаўна і Аляксандр Мікалаевіч аказаліся рады пагаварыць. Не так часта ў іх бываюць госці, толькі дзеці па выхадных прыязджаюць. Вера Катыла — цёзка па прозвішчы сваёй вёскі — не карэнная жыхарка, яна прыйшла ў дом да мужа пасля вяселля ў 1961 годзе. «Была вялікая вёска, — згадвае жанчына, — свая брыгада калгасная, ферма побач, многія там працавалі. А ў кожнага на падворак вечарам з пашы вярталася па дзве-тры каровы, свіней гадавалі, птаства. Людзі руплівыя, стараліся капейку з падсобнай гаспадаркі мець».

— Мы з мужам таксама працавалі ў калгасе, сваю добрую гаспадарку мелі, гадавалі дваіх дзяцей. Так пражылі 17 гадоў, але потым ён трагічна загінуў. Засталася з дзецьмі-школьнікамі і пажылой свякроўю. Дзяцей старалася вывучыць. Хоць мне некаторыя раілі не адпускаць у горад, маўляў, гаспадарка ўласная пойдзе пад адхон. Я не слухала, разважала па-свойму, бо сваю маці некалі паслухала — засталася без спецыяльнасці. Сына пасля васьмі класаў адправіла ў Пружаны ў тэхнікум, потым такім жа чынам вывучыла дачку. Думаю, што дзеці мне цяпер удзячныя. Яны заўсёды мелі добрую работу, карыстаюцца павагай у калектывах, не лайдакі, адным словам. Атрыманыя спецыяльнасці дапамаглі тую працу займець, — працягвае наша гераіня. — А да мяне ўвесь час сваталіся мужчыны з наваколля. Але кожны хацеў забраць да сябе, адзін нават з Камянца прыязджаў. Ды я разважала так: нікуды не пайду са свайго дому. Калі жыццё новае сямейнае не складзецца, хто ты там? А ў сваёй хаце я заўсёды гаспадыня, нават калі прымак прыйдзе. Так і казала кожнаму патэнцыйнаму кавалеру. Пасля чаго ў іх энтузіязму ўбаўлялася і яны з'язджалі.

Прайшло некалькі гадоў, пахавала Вера Данілаўна свякроўку, дзеці падраслі... Неяк да суседкі прыехаў капаць бульбу далёкі сваяк з Віцебскай вобласці. Па-суседску і пазнаёміліся. Адным словам, застаўся ён тут... Так яны з Аляксандрам Мікалаевічам ужо 36 гадоў разам. Ён уладкаваўся на работу трактарыстам, працаваў шмат гадоў у калгасе, тут і на пенсію выйшаў.

— О, як выйшаў на пенсію, я нібы замуж выйшла...

— А што, хіба было дрэнна, калі працаваў? — перапыняю аповед маёй суразмоўніцы.

— Ведаеце, што такое трактарыст на вёсцы? Гэта вечныя просьбы аб дапамозе. Таму заараць, гэтаму забаранаваць, бульбу пасадзіць, выкапаць. Усе разлічваюцца бутэлькай. Калі не самога клічуць, то сябрукоў, а яны дзеляцца адзін з адным. Гэтыя яго таварышы, ахвотнікі да выпіўкі, так мне ўеліся ў косці, каб вы ведалі. І я не змоўчвала, задавала часам перцу свайму чалавеку. Карацей, усякага было, а як на пенсію выйшаў — мір і спакой у доме ўсталяваліся. Разам па хатняй гаспадарцы ўпраўляемся, разам агарод даглядаем, — паказвае на свае градкі гаспадыня. — Людзей у нас, бачыце, амаль не засталося. Летам дачнікі прыязджаюць.

## Выпадковы сусед

Некалькі гадоў назад па суседстве купілі дом. Аказалася, жанчына з горада хацела такім чынам уратаваць сына ад наркатычнай і алкагольнай залежнасці. Тут ужо гаспадар расказвае:

— І першапачаткова, здавалася, за розум узяўся. В'етнамскіх свінак пачаў разводзіць, працаваў ад зары да зары. Харошы хлопец, добрая душа. Мог і суседзям дапамагчы, толькі папрасі. Але нядоўга пратрымаўся. Як зап'е, тыя свінні пішчаць галодныя. Мы іх, бывала, кармілі, бо шкада, жывёліна жывая пакутуе. Потым ён і ў манастыр падаваўся працаваць, і адтуль яго папрасілі. Нічога не выйшла з задумкі маці аб рэабілітацыі на прыродзе і ўласнай гаспадарцы. З'ехаў зноў у горад.

— Вось якое гора для людзей гэтыя п'янка ды наркотыкі, на свае вочы бачылі, не дай бог нікому, — уздыхае Вера Данілаўна.

## Скіт і ваколіца

Дыяс-Канель у сваім першым выступленні ў якасці кіраўніка дзяржавы паабяцаў заставацца верным спадчыне Фідэля і Рауля Кастра. «Я прымаю на сябе адказнасць, якую вы мне даверылі, і перакананы ў тым, што ўсе кубінцы будуць верныя спадчыне гістарычнага лідара кубінскай рэвалюцыі Фідэля Кастра і прыкладу Рауля Кастра, — сказаў ён. — Відавочна, што толькі Кампартыя гарантуе адзінства нашага народа. Рауль будзе прымаць удзел у рашэннях, найбольш важных для сучаснасці і будучыні краіны». Рауль Кастра, у сваю чаргу, адзначыў, што менавіта Дыяс-Канель пасля 2021 года зможа ўзначаліць Кампартыю.

Новы кіраўнік дзяржавы заявіў, што мае намер працягваць курс на актуалізацыю сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця краіны. Гэтыя рэформы, пачатыя Раулем Кастра ў 2010 годзе, прадугледжваюць пашырэнне прыватнага сектара эканомікі і прыцягненне замежных інвестыцый пры захаванні сацыялістычнага характару грамадства і кіраўнічай ролі Кампартыі. «Для тых, хто хоча вяртання да капіталізму, месца не будзе, — падкрэсліў Дыяс-Канель. — Сацыялізм або смерць! Мы пераможам!»

### НОВЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Новы кубінскі лідар заявіў, што знешняя палітыка астраўной дзяржавы не зменіцца, нягледзячы на тое, што ў сучасным свеце становіцца ўсё больш пагроз міжнароднаму міру і бяспецы. «Куба не адмовіцца ад свайго суверэнітэту і незалежнасці, не будзе абмяркоўваць свае прынцыпы і не пойдзе на саступкі пад ціскам і пагрозамі. Але мы заўсёды будзем гатовыя весці дыялог», — сказаў Дыяс-Канель. Рауль Кастра, у сваю чаргу, папракнуў ЗША ў вяртанні да «неакаланіяльнай палітыкі» ў дачыненні да Кубы пасля таго, як у студзені 2017 года новым кіраўніком Белага дома стаў Дональд Трамп. «Прыход Трампа прывёў да развароту ў адносінах, якія характарызуюцца агрэсіўным і пагрозлівым тонам», — падкрэсліў ён.

Нягледзячы на ініцыятывы Барака Абамы, які пабываў у сакавіку 2016 года на Кубе з візітам, Вашынгтон па-ранейшаму не адмяняе эканамічнае эмбарга, уведзенае ў 1961-м. Адносіны паміж ЗША і Кубай абвастрыліся пасля скандалу вакол амерыканскага пасольства ў Гаване, 24 супрацоўнікі якога былі эвакуіраваны з сімптомамі акустычнай паразы нервовай сістэмы. І ўсё ж, як лічаць у навуковым фондзе вашынгтонскага бюро па Лацінскай Амерыцы, адыход Кастра ад дзяржаўнага кіравання можа тэарэтычна адкрыць новыя перспектывы для дыялогу з ЗША. «З-за геаграфічнай блізкасці, падабенства рызык і небяспек Злучаныя Штаты павінны захоўваць і паглыбляць супрацоўніцтва з Кубай. Калі гэтага не адбудзецца, то нацыянальныя інтарэсы ЗША апынуцца пад пагрозай, а дасягнуты прагрэс у важных сферах агульных інтарэсаў будзе пастаўлены пад пытанне», — гаворыцца ў заяве фонду.

Супрацоўнік Цэнтра палітычных даследаванняў Інстытута Лацінскай Амерыкі РАН Эдуард Белы ў размове з «Коммерсантом» адзначыў: «Палітыка Трампа досыць эксцэнтрычная, але гэта палітыка бізнесмена, які перш за ўсё вымярае ўсё грашыма». Эксперт мяркуе, што прэзідэнт ЗША цалкам можа зацікавіцца выгаднымі з эканамічнага пункту гледжання праектамі на Кубе. Дарэчы, за год знаходжання Дональда Трампа ва ўладзе тавараабарот паміж ЗША і Кубай павялічыўся на 15,4 % і склаў $283 млн.



### БЕЗ РЭЗКІХ КРОКАЎ

Рауль Кастра абвясціў, што кубінскія ўлады ў найбліжэйшы час зоймуцца распрацоўкай новай канстытуцыі краіны. Такі крок неабходны для таго, каб асноўны закон, цяперашні варыянт якога быў прыняты ў 1976 годзе, адпавядаў патрабаванням часу. «На ліпеньскім пасяджэнні Нацыянальнай асамблеі будзе прапанавана стварыць дэпутацкую камісію, якая зоймецца распрацоўкай і прадстаўленнем праекта новай канстытуцыі Кубы, якую неабходна абмеркаваць з насельніцтвам і вынесці на рэферэндум», — сказаў Кастра.

Ён таксама адзначыў, што адной з прыярытэтных эканамічных задач, якія давядзецца вырашаць новаму кубінскаму ўраду, з'яўляецца валютная ўніфікацыя. Пра неабходнасць гэтай рэформы гаворыцца ўжо больш за дзесяць гадоў. Цяпер на востраве адначасова выкарыстоўваюцца дзве валюты — нацыянальны, а таксама канвертаваны песа. Бівалютная сістэма ўведзена на Кубе ў 1994 годзе і афіцыйна лічыцца адной з асноўных перашкод для развіцця краіны і прыцягнення замежных інвестыцый.

Па факце Куба ўжо даўно ўяўляе сабой постіндустрыяльнае грамадства. 72 % насельніцтва занята ў сэрвісных паслугах, тут жа ствараецца амаль 3/4 ВУП. Дзяржава магла б узяць прыклад з В'етнама і пачаць інтэнсіўна развіваць сэрвісную эканоміку — пляжы і клімат вострава ў Карыбскім моры ствараюць усе ўмовы для прыцягнення турыстаў. Тым больш што на Кубе апошнім часам сапраўдны турыстычны бум. Летась тут пабывалі 4,7 млн замежных турыстаў, у тым ліку 1,1 млн амерыканцаў, што амаль утрая больш, чым у 2016 годзе. Чакаецца, што сёлета інтурыстаў будзе да 5 млн — найбуйнейшыя амерыканскія авіякампаніі плануюць павелічэнне колькасці рэйсаў на карыбскі востраў. У турыстычную галіну паступаюць асноўныя замежныя інвестыцыі, у тым ліку з Іспаніі, Францыі, Канады, Кітая, Германіі.

Пакуль незразумела, якую канкрэтна праграму будзе рэалізоўваць Дыяс-Канель і наколькі радыкальныя ён будзе праводзіць рэформы. Аднак большасць экспертаў сыходзіцца ў меркаванні, што падстаў чакаць ад яго нейкіх рэзкіх крокаў, прынамсі ў найбліжэйшы час, няма. Як відаць, новы кіраўнік дзяржавы будзе працягваць распачатую Раулем Кастра палітыку «актуалізацыі» сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця краіны, якая прадугледжвае ў першую чаргу пашырэнне прыватнага сектара эканомікі пры захаванні сацыялістычнага характару грамадства і кіраўнічай ролі Кампартыі.

Як заўважаюць эксперты, лібералам новага кіраўніка дзяржавы не назавеш. Напрыклад, летась ён выступіў з жорсткай заявай у адрас Злучаных Штатаў. Апошнія падзеі ў рэгіёне даказваюць вернасць слоў Чэ Гевары пра тое, што «ніколі не варта верыць імперыялізму — ні на вось столечкі, ні ў чым», сказаў тады Дыяс-Канель, маючы на ўвазе ціск ЗША на Венесуэлу і рашэнне прэзідэнта Дональда Трампа павярнуць назад нармалізацыю адносін з суседнім востравам, распачатую Баракам Абамам.

**Захар БУРАК**

# «ПРЫХОДЗЬЦЕ НА НАС ПАГЛЯДЗЕЦЬ!»

**97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна.**
**102,4 FM — Мядзел,**
**102,6 FM — Крупкі,**
**104,2 FM — Барысаў.**
**104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы.**
**105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань.**
**105,5 FM — Беразіно, Чэрвень,**
**105,6 FM — Старыя Дарогі.**
**107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.**



Дырэктар УП «Мінская хваля» Т. Г. ВЯЦКАЯ і начальнік рэкламна-прамоўтарскага аддзела УП «Мінская хваля» Н. В. ЯРМОЛЕНКА.

Вось кожны год удзельнічаем у выстаўцы «СМІ ў БЕЛАРУСІ» — і кожны год так хочацца ўсіх здзівіць! На гэты раз 3 мая — дзень «МІНСКАЙ ХВАЛІ» — мы адзначым феерверкам падзей. І паколькі назвалі мы сваё дзейства проста «ГЭТА РАДЗІМА МАЯ», то і, як той казаў, — пройдзем. Выступленне пераможцаў пяці этапаў адкрытага абласнога дзіцячага спеўнага конкурсу «Просты матыў» + вядучых Хелены Мераі, Руслана Асланава, Данаі Шаршавіцкай; падвядзенне вынікаў конкурсу вершаў пра малую Радзіму; віктарына МНС з падарункамі; дэфіле-паказ мадэляў партнёраў («Світанак» + дзеці + фотасесія з Місіс Сусвету — 2015 Святланай Статкевіч); Генадзь Пшэнік — віктарына пра Мінскую вобласць, чытае свае вершы і рубрыку «100 фактаў пра Міншчыну»; віктарына «Гоша ведае — гаворым правільна з Мінскай хваляй»; майстар-клас па візажы з «Белор-дызайнам»; «Светлае ТБ» з Барысава з майстар-класам па брошках; дэгустацыя прадукцыі кандытарскай фабрыкі «Алвеста» і Клецкага вытворча-харчовага завода і ЗАТ «Малкут»; прэзентацыя «Бульба-хіт» з Мікітам Найдзёнавым.

Мала? Дадам: ва УП «Мінская хваля» ёсць шэраг пераваг: дакладны рэгіён вяшчання — сталіца і Мінская вобласць, што павялічвае працэнт траплення інфармацыі канкрэтнаму адрасату; эксклюзіўны праграмны прадукт дзякуючы прафесійнай службе інфармацыі; вялікі выбар аўтарскіх музычна-забаўляльных і інфармацыйна-аналітычных інтэрактыўных праграм. Радыёстанцыя пастаянна развівае каналы камунікацыі са сваёй аўдыторыяй: эфір, інтэрнэт, масавыя мерапрыемствы (спонсары і партнёры маюць магчымасць інтэграцыі ў афлайн-праект МВ-радыё). УП «Мінская хваля» актыўна супрацоўнічае з прэс-службамі ўсіх міністэрстваў і ведамстваў краіны. Таксама трэці год актыўна ўдзельнічаем у Рэспубліканскім конкурсе «Белазаўскі акорд», што дало магчымасць падняць наведвальнасць нашага сайта.

Арганізавана работа па прыцягненні вядомых медыяперсон як нашай краіны, так і замежжа, вынік — павелічэнне «гасцявых» (жывых) эфіраў радыёстанцыі і ўзмацненне станоўчага дзелавога іміджу прадпрыемства ў творчым, культурным і дзелавым асяроддзях краіны, а таксама павышэнне цікавасці да радыёпраграмы з боку слухачоў і зваротная сувязь з аўдыторыяй. Асабліва адзначым спецпраект «Героі Міншчыны! Мы памятаем» да святкавання 70-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мэта праекта — нагадаць маладому пакаленню пра народны подзвіг, людзей і іх ахвяры ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пра геаічнае мінулае нашай Радзімы. Вынікам стаў цыкл праграм з 77-і выпускаў. Праект атрымаў станоўчую зваротную сувязь ад слухачоў. Прыйшла да нас Наталля Стрыжак — і па-іншаму задыхалі праграмы «Азбука здароўя», «Выхад у свет» і «Продкі.бай», яна прынесла на Хвалю мяккасць, пяшчоту, выдатную родную беларускую мову.

**Слоганы УП «Мінская хваля» — «Добрае радыё для добрых людзей», «Ніколі не штарміць», гэта ў поўнай меры адлюстроўвае сутнасць эфіру.**

***З'явіліся ў нас і новыя праграмы. Напрыклад, «Гаворым правільна з «Мінскай хваляй»», вядзе яе Гоша Куніцкі — удзельнік праграмы «Лепш за ўсіх», юны вундэркінд.***

Яшчэ па раніцах ідуць «Сакрэты ад Светы», і вядзе праграмку Святлана Статкевіч — уладальніца тытула «Місіс сацыяльная актыўнасць» конкурсу «Місіс Сусвет — 2015». Адзначым музычны чарт айчыннай музыкі і выканаўцаў «Бульба-хіт» на чале з новым вядучым — паэтам, кампазітарам, музыкантам Мікітам Найдзёнавым. Праект мы запусцілі ў новай якасці. «Бульба-хіт» — гэта пляцоўка для маладых, часам нават невядомых выканаўцаў, аўтараў, груп, якія, на погляд «Мінскай хвалі», вартыя самай пільнай увагі аўдыторыі. Чарт стаў інтэрактыўным — кожны выпуск музыканты ў жывым эфіры прэзентуюць свае свежыя сінглы з віктарынамі, прэм'ерамі, навінамі, анлайн-чатам і відэа. Праект атрымаўся і ўжо карыстаецца поспехам у слухачоў «Мінскай хвалі», і на яго ўсё часцей звяртаюць увагу артысты і прадзюсары як на дзейсны інструмент на шляху да пазнавальнасці і поспеху.

Ужыты яшчэ адзін іміджавы прыём: так званы бягучы радок пра «Мінскую хвалю» з'явіцца на дысплэях радыёпрыёмнікаў. Сумесна з упраўленнем адукацыі праведзены тры акцыі: «Сустрэча выпускнікоў», «Выпускны з Хваляй», «Добры дзень, школа». Тройчы прайшла акцыя «Пешшу па краіне» — мы суправаджалі спевака Аляксандра Сухарава ў яго пешых паходах па вобласці з канцэртамі. Новая рубрыка «Ураджайная пара» на радыё «МІНСКАЯ ХВАЛЯ» выходзіла ў эфір з пачатку ўборкі збожжавых — вядучы рубрыкі называў канкрэтныя прозвішчы, экіпажы, гаспадаркі і іх вынікі, а таксама прысвячаў ім песню.

**Тамара ВЯЦКАЯ.**

*Рэкламна-прамоўтарскі аддзел радыё «Мінская хваля»*
*+375 (17) 228 13 44; +375 (29) 365 50 21*
*reklamamv@mail.ru; reklama@mvolna.by*
УНП 690262864

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Сахарторг» (продавец) извещает о проведении 14 мая 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 350/U-169494, площадью 1 176,4 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **незавершенное законсервированное капитальное строение.** Адрес: г. Гомель, ул. Чечерская, д. 42А. Степень готовности – 75 %. **Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002004549** общей площадью **0,0894 га** – для строительства магазина продовольственных товаров. **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21). Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005356** общей площадью **0,0297 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок № 1). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21). Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005357** общей площадью **0,0072 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок № 2). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21)** | **961 884,00** | 48 094,20 |

**Продавец:** ОАО «Сахарторг», г. Гомель, ул. Могилевская, д. 1а. Контактный тел. 8 (0232) 21-00-34 – Землянская Виктория Викторовна. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Сахарторг»):** р/счет BY67 BLBB 3012 0400 0783 7200 1001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, ул. Советская, 7, БИК BLBBBY2X, УНН 400078372, ОКПО 28834675, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 апреля 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00, **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10 мая 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение о торгах опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2018 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

**Объявление о торгах**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот № 1. Автомобиль «Тойота Старлет», 1992 года выпуска, регистрационный номер 9694ВТ6. Первоначальная стоимость – 645,6 рубля |
| Собственник (владелец) имущества | Зейналов Нариман Олегович |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Орша, 2-й пер. Коммунальный 2, штрафстоянка КУП «Оршанская спецавтобаза» |
| Информация об обременениях | Без обременений |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 5. 23 мая 2018 года в 11.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г .Орша, ул. Островского, 36. Судебный исполнитель – Коробова Ольга Владимировна, тел.: 80216543215, 80333998323. Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши BY22AKBB36429030007942200000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код банка AKBBBY21215, УНП 300002505, не позднее 18.05.2018 г. Минимальная величина первого шага – 5 % стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 97 Закона «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

**Объявление о торгах**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот № 1. Автомобиль «КИА КАРНИВАЛ», 1999 года выпуска, регистрационный номер 4158ЕМ2. Первоначальная стоимость – 2618 рублей 40 копеек |
| Собственник (владелец) имущества | Ильин Артем Андреевич |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Орша, пр-д Мичурина, д. 5 |
| Информация об обременениях | Залог ЗАО «Банк ВТБ» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 5. 17 мая 2018 года в 11.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36. Судебный исполнитель – Нараленкова Анастасия Владимировна, тел. 80216543215, 80333998317. Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши BY22AKBB36429030007942200000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код банка, AKBBBY21215 УНП 300002505, не позднее 14.05.2018 г. Минимальная величина первого шага – 5 % стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 97 Закона «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

■ Вялікія

# ВІРТУОЗ СКРЫПКІ

## Цікавыя факты з жыцця Нікола Паганіні



**Сын партовага грузчыка з італьянскага горада Генуі, Паганіні, тым не менш, дзякуючы свайму таленту змог стаць баронам і зарабіць некалькі мільёнаў франкаў. Гэты змрочнага выгляду чалавек, гулец і дэбашыр, зусім мяняўся, узяўшы ў рукі скрыпку. Нават тым, хто лічыў, што яго слава найлепшага скрыпача ў свеце разадзьмутая, даводзілася змірыцца, калі яны чулі яго ігру.**

Калі хлопчыку споўнілася пяць гадоў, бацька, заўважыўшы здольнасці сына, пачаў вучыць яго музыцы спачатку на мандаліне, а з шасці гадоў — на скрыпцы. Шлях да славы ў Паганіні не ішоў беспершкодна. З дзяцінства яму даводзілася цярпець тыранію бацькі, які прымушаў яго займацца музыкай цэлымі днямі, не дазваляючы выходзіць на вуліцу. Ад недахопу кіслароду, руху і празмерных нагрузак хлопчык трапіў у каталептычную кому. Бацькі палічылі яго памерлым і ледзь не пахавалі. Пасля хваробы ён не спыніў заняткаў, а, наадварот, стаў займацца вельмі захоплена і ўпарта, і хутка слава пра таленавітага скрыпача выйшла далёка за межы Генуі.

У 8-гадовым узросце Паганіні напісаў скрыпічную санату і некалькі цяжкіх варыяцый. У юным узросце ён стварыў вялікую частку сваіх знакамітых капрычыа, якія да гэтага часу застаюцца ўнікальнай з'явай музычнай культуры. У ігры на скрыпцы Паганіні быў сапраўдным віртуозам. Хутка асвоіўшы традыцыйную тэхніку, ён пачаў эксперыментаваць: імітаваў спевы птушак і чалавечы смех, гучанне флейты, трубы, ражка, мыканне каровы, ужываў разнастайныя гукавыя эфекты.

Юнага віртуоза хацелі аддаць у навучанне знакамітаму скрыпачу Алесандра Рола. У той дзень, калі бацька і сын Паганіні наведалі майстра, апошні быў хворы і не збіраўся нікога прымаць. У пакоі побач са спальняй маэстра на стале ляжалі ноты канцэрта, напісанага Рола, і скрыпка. Нікола ўзяў інструмент і сыграў з ліста твор, створаны напярэдадні. Здзіўлены Рола выйшаў да гасцей і, убачыўшы, што яго канцэрт грае хлопчык, заявіў, што ўжо не можа нічому навучыць яго.

На канцэртах Паганіні ладзіў сапраўднае шоу. На публіку гэта стварала настолькі моцнае ўражанне, што некаторыя гублялі прытомнасць у зале. Кожны нумар і выхад ён прадумваў да драбнюткіх дэталяў. Усё было адрэпеціравана: ад рэпертуару, які складаўся выключна з уласных кампазіцый, да эфектных трукаў накшталт струны, якая лопнула, засмучанай скрыпкі і «прывітання з вёскі» — перайманне гукаў жывёл.

Паводле ўспамінаў самога Паганіні, у першы час самастойнага жыцця, акрамя страсці да жанчын, ён апантана кінуўся ў картачныя гульні. Часта ён прайграваў усё, і «толькі яго ўласнае мастацтва магло выратаваць яго», але ён здолеў адмовіцца ад азартных гульняў і больш ніколі не дакранаўся да картаў.

Аднойчы Паганіні заключыў пары пра тое, што зможа дырыжыраваць аркестрам з дапамогай скрыпкі, на якой будуць усяго дзве струны. Яму ўдалося не толькі выйграць заклад, але і зрабіць уражанне на сястру Напалеона Элізу Банапарт. Існуе легенда, што ўражлівая карсіканка ад захаплення страціла прытомнасць. Так нібыта пачаўся іх раман. Паганіні атрымаў тытул «прыдворнага віртуоза» і адначасова быў прызначаны капітанам асабістай гвардыі княгіні.

Ігра на дзвюх струнах не стала мяжой магчымасцяў Паганіні: у дзень нараджэння Напалеона ён пераўзышоў самога сябе, сыграўшы на адной струне. Да Элізы скрыпач хутка страціў цікавасць і захапіўся іншай сястрой Банапарта Палінай Баргезэ. Іх сувязь была такой жа нядоўгай.

Так жа лёгка, як жанчын, Паганіні скараў гарады і краіны. Яму апладзіравалі ў Італіі, Аўстрыі, Германіі, Францыі, Англіі, Ірландыі. Усюды, дзе ён з'яўляўся, тут жа здараліся пацешныя гісторыі, якія спараджалі чуткі. Генрых Гейнэ пра гэта пісаў у «Фларэнтыйскіх начах»: «Так, мой сябар, справядліва тое, што ўсе пра яго кажуць. Што, калі Паганіні быў капельмайстрам у Лука, ён закахаўся ў адну тэатральную прымадонну, прыраўнаваў яе да нейкага нікчэмнага абата, магчыма, стаў раганосцам, а затым, па добрым італьянскім звычаі, закалоў сваю няверную каханую, трапіў у Геную на катаргу і прадаў сябе нарэшце чорту, для таго, каб стаць найлепшым у свеце скрыпачом».

У Германіі Паганіні купіў тытул барона, які перадаваўся ў спадчыну.

Ва ўзросце 34 гадоў музыкант захапіўся 22-гадовай спявачкай Антоніяй Б'янкі, якой ён дапамагаў з падрыхтоўкай сольнага выступлення. У 1825 годзе ў Нікола і Антоніі нарадзіўся сын Ахіл. У 1828 годзе Паганіні расстаўся з жанчынай, дабіўшыся аднаасобнай апекі над сынам.

Пасля канцэрта ў Вене адзін са слухачоў сцвярджаў, што ён бачыў, як за спінай музыканта стаяў д'ябал і вадзіў яго рукой са смычком. Журналісты падхапілі гэтую навіну і паведамлялі яе зусім сур'ёзна. На шматлікіх карыкатурах яго адлюстроўвалі непрыгожым, у газетах характарызавалі як сквапнага, скупога і дробязнага чалавека, зайздроснікі і ворагі распускалі пра яго недарэчныя чуткі. Дурная слава суправаджала яго ўсюды і заўсёды.

Паганіні актыўна гастраляваў па Еўропе, і ўсюды яго канцэрты карысталіся неверагоднай папулярнасцю. Шмат працуючы, музыкант даваў канцэрты адзін за адным. Жадаючы забяспечыць сыну годную будучыню, ён патрабаваў сабе велізарных ганарараў, так што пасля сваёй смерці ў 1840 годзе пакінуў багацце ў некалькі мільёнаў франкаў.

Нікола Паганіні быў масонам. Ён напісаў масонскі гімн і выканаў яго ў ложы Вялікага Усходу Італіі, дакументы таварыства таксама пацвярджаюць яго прыналежнасць да масонаў.

Маэстра памёр у 57 гадоў, на працягу ўсяго жыцця ў Паганіні было мноства хранічных захворванняў. У 1834 годзе з-за сухотаў музыканту давялося вярнуцца ў родную Генную, прыступы кашлю не давалі яму размаўляць. Жахліва пакутуючы ад цяжкіх прыступаў, музыкант памёр у Ніцы 27 мая 1840 года.

Паганіні катэгарычна адмаўляўся пісаць псалмы для царкоўнікаў, таму тыя пастаянна злосна казалі пра яго. А пасля смерці Паганіні біскуп Ніцы абвінаваціў яго ў ерасі і забараніў царкоўнае пахаванне яго астанкаў. Пахаванне адбылося праз 56 гадоў пасля яго скону, і відавочцы сцвярджалі, што яго цела ўвесь гэты час заставалася нятленным, а з магілы даносіліся гукі скрыпкі. Так нават пасля смерці геніяльны скрыпач заставаўся прадметам чутак і легендаў.

Сваю любімую скрыпку работы Гварнеры віртуоз завяшчаў роднаму гораду, Генуі (маэстра не хацеў, каб на ёй нехта граў пасля яго смерці). Пазней інструмент атрымаў імя «Удава Паганіні» ■

■ Факт

# Пінск налета стане культурнай сталіцай

**Пінск вызначаны культурнай сталіцай краіны на 2019 год. Такое рашэнне прыняла калегія Міністэрства культуры. Цяпер сталіца Палесся на год ператворыцца ў культурную сталіцу нашай краіны.**

У Пінску ёсць што паказаць і айчынным, і замежным турыстам, ёсць дзе правесці канцэрт альбо іншае значнае мерапрыемства. Трэці па велічыні горад Брэсцкай вобласці трымае першынство па наяўнасці старадаўніх помнікаў архітэктуры і культуры. Езуіцкі калегіум, кляштар францысканцаў, велічны касцёл Успення Прасвятой Дзевы Марыі — а ўсяго ў гістарычным цэнтры горада 163 аб'екты, уключаныя ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Не так даўно адрэстаўраваны палац Бутрымовічаў, былы касцёл Карла Барамея стаў гарадской канцэртнай залай.

Дарэчы, у Пінску трывалыя культурныя традыцыі: ёсць прафесійны тэатр, які вырас з самадзейнага калектыву. Штогадовымі сталі канцэрты класічнай музыкі «Лютаўскія музычныя вечары», два дзясяткі самадзейных калектываў маюць званні «народнага», «заслужанага» і «ўзорнага».

У 2019 годзе ў Пінску запланаваныя фестывалі, выстаўкі, канцэрты не толькі гарадскога і абласнога ўзроўняў, але і рэспубліканскія, а таксама міжнародныя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■

■ Прыгожае жыццё

# У «Міс Беларусь» можа з'явіцца ўласны гімн

## Інтрыга конкурсу вырашыцца на фінальным шоу 4 мая

**Ужо на наступным тыдні будзе названа імя пераможцы Нацыянальнага конкурсу прыгажосці, які праводзіцца ў Беларусі раз на два гады, пачынаючы з 1998-га. На карону прэтэндуюць 30 абаяльных, прывабных, разумных, актыўных і таленавітых дзяўчат ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў.**

Як расказалі «Звяздзе» на тэлеканале АНТ, які ўжо 10 гадоў выступае адным з арганізатараў конкурсу, у фіналістак шоу вельмі насычаны графік падрыхтоўкі: кожны дзень распісаны з 9 да 22 гадзін. Асаблівая ўвага ўдзяляецца ўрокам харэаграфіі, бо рэжысёры фінальнага шоу вырашылі разнастаіць звыклыя дэфіле харэаграфічнымі пастаноўкамі ў стылістыцы чатырох стыхій — зямлі, агню, паветра і вады. Ужо вядома, што вядучымі «Міс Беларусь» будуць акцёр Дзмітрый Мухін і спявачка Ганна Шаркунова, а ў зале за сцэнай канкурсантак падтрымае акцёр Максім Сокал.

Спецыяльнымі гасцямі фінальнага шоу стануць Уладзімір Праснякоў і Наталля Падольская. Акрамя таго, на сцэне сталічнага Палаца спорту адбудзецца прэм'ера адразу дзвюх песень. Так, спецыяльна для «Міс Беларусь» кампазітар Яўген Алейнік напісаў песню «Беларускія прыгажуні», якую ў кулуарах ужо называюць неафіцыйным гімнам конкурсу. А песня «Хварэем за сваіх» Леаніда Шырына, якую выканае мужчынскі квартэт у складзе Івана Вабішчэвіча, Тэа, Юзары і Аляксандра Патліса, прысвечаная будучым II Еўрапейскім гульням.

«Міс Беларусь — 2018» атрымае не толькі адмысловую карону і права прадставіць нашу краіну на міжнародных конкурсах прыгажосці, але таксама грашовы прыз у памеры 500 базавых велічынь і пазадарожнік Geely Atlas. Значныя сумы атрымаюць і ўладальніцы тытулаў «Першая віцэ-міс» і «Другая віцэ-міс», падарункі ад партнёраў і спонсараў прадугледжаны і для ўладальніц іншых намінацый. Паўдзельнічаць у выбары адной з іх, «Міс глядацкіх сімпатый», дарэчы, можа кожны ахвотны — галасаванне ўжо ідзе на сайце тэлеканала АНТ www.ont.by.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

# «Ідзе вясёлы май!»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Тое, што і дзічына. **3.** На Юр'е (6 мая) ... — будзе добры авёс (прык.). **6.** Жывёліна-«шахцёр», якая прыносіць шмат клопатаў агароднікам. **11.** «Слаўнаму месяцу маю // Славу пяюць ...». З верша А. Астрэйкі «Сонца вясенняе свеціць». **12.** ... майскі — прыгожая кветка, якая, як і цюльпан, лічыцца сімвалам мая. **14.** Ласкавая назва сонца. **18.** Май вясну канчае, а ... пачынае (прык.). **19.** Майская ... галоднага корміць (прык.). **20.** Планета Сонечнай сістэмы. **23.** Сельскагаспадарчая прылада. **24.** Водгук, водгалас (перан.). **27.** «Пад сонцам ..., // Свабодны ...». З верша П. Труса «Май». **28.** «Цёплы майскі ... неба абдымае». З верша С. Бранта «Абдымкі майскага вечара». **30.** Барадаты карлік. **34.** Лепей свой посны ..., чым чужое сала (прык.). **38.** Вокны. **40.** Рамка для патронаў. **42.** «... Перамогі, што для ўсіх адзіны, // Пранёс Чырвонай арміі салдат». З верша У. Скарамоха «Салдат Перамогі». **43.** «Пашыраецца, Май, твой пабедны паход // На далёкі, на блізкі і ... , і ўсход». З верша Я. Купалы «З Першым маем».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** ... халады лічацца ў маі: калі чаромха цвіце, і калі дуб распускаецца (прыкм.). **2.** ... Веснавы, апякун хлебароба; прысвятак, які адзначалі 21 мая. **4.** Газ, які ўжываецца для ачышчэння паветра. **5.** Болесуцішальны і наркатычны сродак. **7.** Усходы азімых культур. **8.** Лік і лічба. **9.** Пісьмо. **10.** Праграма якога-небудзь дзеяння. **11.** Лугавая расліна з ружовымі кветкамі. **13.** Май — радасць, а чэрвень — ... (прык.). **15.** Прадукты харчавання. **16.** Прысвятак беларусаў-католікаў; яго адзначалі 8 мая («Сей лён на ... — вырасце, як лава» (прык.). **17.** «Вясна нам дорыць ..., // І будзіць нас дарыць любоў». З верша А. Грушэцкага «Вясна». **21.** Старажытнаславянскі бог веснавой урадлівасці, свята ў гонар якога адзначалі 10 мая. **22.** «Вясна ... пятага года». З песні «Майскі вальс», прысвечаной святу Перамогі (сл. М. Ясеня. муз. І. Лучанка). **25.** ... Веснавы, свята пастухоў; прысвятак, які адзначалі 22 мая. **26.** ..., або Тройца. Свята, якое беларусы-праваслаўныя адзначаюць сёлета 27 мая, а беларусы-каталікі — 20 мая. **29.** «Красавік — ... маланак і ліўняў, // Травень — з першым каханнем, сяўбой». З верша П. Панчанкі «Родная мова». **31.** «Хмельны сад цвіце. Салаўіны свіст. // Чуцен ... — // Русавалосы грае трактарыст». З верша М. Танка «У садочку май». **32.** Паданне пра якую-небудзь падзею, асобу. **33.** Тая, што жне ўручную, сярпом. **35.** ... ластаўка вясны не робіць (прык.). **36.** «Ідзе, весяліцца Перамога, // І ёю пахне ўсё на свеце: // Лісцё і ..., зямля і вецер». З верша Я. Сіпакова «Сяўба». **37.** Без ведаў — не будаўнік, без зброі — не ... (прык.). **39.** Вялікі кусок (разм.). **41.** «На свята ўсенароднае // К нам з песняю паходнаю // Ідзе вясёлы ...!». З верша Я. Коласа «Пераможны май».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Дзіч. 3. Мароз. 6. Крот. 11. Салаўі. 12. Ландыш. 14. Сонейка. 18. Лета. 19. Трава. 20. Марс. 23. Вілы. 24. Рэха. 27. Край. 28. Вечар. 30. Гном. 34. Прэснак. 38. Аконне. 40. Абойма. 42. Сцяг. 43. Захад. 44. Гной. **Па вертыкалі:** 1. Два. 2. Іван. 4. Азон. 5. Опій. 7. Рунь. 8. Тры. 9. Ліст. 10. План. 11. Смолка. 13. Шчасце. 15. Ежа. 16. Станіслаў. 17. Закаханне. 21. Ярыла. 22. Сорак. 25. Мікола. 26. Сёмуха. 29. Час. 31. Спеў. 32. Сказ. 33. Жняя. 35. Адна. 36. Неба. 37. Воін. 39. Кус. 41. Май.

Даты | Падзеі | Людзі

**28 КРАСАВІКА**

У краіне

**1387** год — вялікі князь літоўскі і кароль польскі Ягайла перадаў Менеск у валоданне свайму брату Скіргайлу.

**1765** год — створаны Ружанскі тэатр Сапегаў. Дзейнічаў да 1791 г. у мястэчку Ружаны. Размяшчаўся ва ўсходнім корпусе Ружанскага палацавага комплексу. Налічваў «60 артыстаў і танцоўшчыкаў», 40 музыкаў. Меў таксама музычна-оперную школу, капэлы ў Ружанах, Дзярэчыне (цяпер у Зэльвенскім раёне), Зэльве. Сярод пастановак: аднаактная опера «Вясковы чараўнік» Ж.-Ж. Русо, балеты «Арыянка», «Літасцівасць Ціта».



**1775** год — адкрылася Гродзенская медыцынская акадэмія, першая ў Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы медыцынскага персаналу. Дзейнічала да 1782 года. Адкрыта па ініцыятыве гродзенскага старосты А. Тызенгаўза. Арганізатар і кіраўнік акадэміі — Ж. Э. Жылібер. Функцыянавалі тры аддзяленні: падрыхтоўкі гарадскіх лекараў (10 чалавек), правінцыйных лекараў і хірургаў (20 чалавек), аддзяленне павітух (акушэрскае), спачатку на 5, пазней — на 17 чалавек. Навучэнцы ўтрымліваліся за кошт казны. Пры акадэміі існавалі шпіталь на 60 ложкаў, анатамічны тэатр і музей, кабінет прыродазнаўства, аптэка, бібліятэка.

**1887** год — нарадзіўся (г. Васілевічы, цяпер у Рэчыцкім раёне) Ота Магнусавіч Гедэман, беларускі гісторык, краязнаўца, натураліст, педагог. Збіраў матэрыялы па гісторыі Браслаўшчыны, вывучаў магдэбургскае права, развіццё гандлю і рамёстваў, сацыяльную структуру і маёмасныя адносіны насельніцтва ў беларускіх гарадах Сярэдняга Падзвіння, лясныя здабычы і водныя шляхі на тэрыторыі Беларусі ў XVII—XVIII стст., гісторыю Белавежскай пушчы. Выдаў кнігі пра Дзісну, Друю, Глыбокае, Браслаў, Браслаўскі павет. Памёр у 1937 годзе.

У свеце

**1914** год — у ЗША быў запатэнтаваны паветраны кандыцыянер. Кандыцыянер прызначаўся для падтрымання патрэбнай тэмпературы і вільготнасці ў памяшканні. Упершыню аб кандыцыянеры як вынаходстве стала вядома ў 1815 годзе, калі француз Жан Шабанэс запатэнтаваў метад кандыцыянавання паветранага патоку і спосаб рэгулявання тэмпературы ў будынках. Нягледзячы на перспектыўную ідэю кандыцыянавання паветра ў памяшканнях, яе практычнага прымянення прыйшлося чакаць яшчэ 100 гадоў.

**1968** год — на экраны выйшла камедыя Леаніда Гайдая «Брыльянтавая рука», у якой ігралі Ю. Нікулін, А. Папанаў, А. Міронаў, Н. Мардзюкова, Н. Грабяшкова, С. Святлічная.

■ Новае ў кнігавыданні

# РАМАН З ЖЫЦЦЁМ. ДЗЁННІКІ І ВЕРШЫ

Віктар Шніп — імя паэта, які вызначыў свой круг, сваю прастору ў сучасным мастацкім, літаратурным жыцці Беларусі. Кожная новая кніга майстра літаратурнага цэха набывае шырокае гучанне, выклікае цікавасць у чытачоў. Кожная яго новая кніга прымушае нават зайздроснікаў зазіраць на яе старонкі. «Трава бясконцасці» — твор, жанр якога Віктар Шніп вызначыў як дзённікавы раман паэта.

Будзённыя (а мо і святочныя таксама) запісы са штодзённага жыцця мяжуюцца з вершамі. Што гэта? Празаічна-паэтычная хроніка «літаратурнага побыту»? Ці жаданне такім чынам засведчыць ацэнку часу і прасторы, якая насычае свядомасць літаратара мастацкімі вобразамі і сімваламі? Мо гэта канспект будучых раманаў іншых аўтараў?.. А чаму б і не?!. Чаму хронікі, запісаныя ўважлівым і чуйным назіральнікам за навакольнымі працэсамі, карэктным, як мне падаецца, аглядальнікам чужых лёсаў, напоўненыя аўтарскім «Я», не могуць стаць асновай будучай мастацкай гісторыі літаратурнага, культурнага жыцця пачатку XXI стагоддзя?!.

Так, у дзённікавым рамане прысутнічае шмат асабістага. Тут і ўласныя сны, і зацемкі сустрэч з роднымі і блізкімі, роднай вёскай Пугачы, трывогі за дзяцей, ды і трывогі за ўвесь свет («28.02.2015. У Маскве ўначы, амаль на Краснай плошчы, застрэлілі расійскага палітыка Барыса Нямцова. Нечакана, але я не здзівіўся. Страшна, што адбываецца ў Расіі...»)... У кнізе хапае гумару. Часам смешнае афарбоўваецца ў розныя колеры і становіцца фрагментам люстэрка, у якое варта, пэўна, угледзецца і праз гады. «9.12.2014. У 1987 годзе споўнілася 100 гадоў з дня народзінаў Алеся Гаруна. Акурат у той сакавіцкі дзень, калі адзначаўся юбілей паэта, супрацоўнік часопіса «Маладосць» Алесь Гаўрон па п'янцы трапіў у міліцыю. Старшы сяржант, які складаў пратакол, раптам перапыніў сваю пісаніну і запытаўся: «Гэта ваш юбілей сёння ўся Беларусь адзначае?» — «Мой!» — упэўнена адказаў Гаўрон. «А што ж вы маўчыцё?! Мы вас дахаты даставім!» — усхапіўся міліцыянер і загадаў адвезці Алеся, куды ён скажа...»

Калаўрот падзей, паэтычных і мастацкіх імпрэз, шчырыя згадкі пра тых, хто сустракаўся і сустракаецца Віктару Шніпу па жыцці, уцягвае ў вір старонак «Травы бясконцасці», нагадвае пра вечнасць здзейсненага, служыць напамінам, што крокі маюць асаблівасць пакідаць сляды. І на пяску, і на вадзе. Ёсць нават сляды ў тых нашых кроках, што спалучаны з дыханнем у суладдзі з часам, у суладдзі з рэчаіснасцю.

**Мікола БЕРЛЕЖ** ■

**Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў сераду, 2 мая.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.40 | 20.35 | 14.55 |
| Віцебск | 5.26 | 20.29 | 15.03 |
| Магілёў | 5.30 | 20.25 | 14.55 |
| Гомель | 5.32 | 20.17 | 14.45 |
| Гродна | 5.56 | 20.49 | 14.53 |
| Брэст | 6.01 | 20.45 | 14.44 |

## Месяц

***Першая квадра 23 красавіка. Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

***Пр.** Анастасіі, Васілісы, Аляксандра, Андрэя, Арыстарха, Віктара, Кандрата, Трафіма, Якава.*
***К.** Кацярыны, Рыты, Людовіка, Роберта.*




Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Дарагая, я вырашыў, што больш ніколі не буду з табой сварыцца!
— Не, вы паглядзіце на яго, ён вырашыў... А мяне ты спытаў?!

**Пісьменнасць з'явілася ў старажытных людзей разам з неабходнасцю падпісваць гарлачыкі з расадай, каб увесну не пераблытаць.**

— Шэф, вольны?
— Запомніце ўжо, Іваноў, я не таксіст, а ваш начальнік.

**На працы і акно — тэлевізар.**

— Сардэчна запрашаем у наш дружны калектыў.
— Можна я адчыню акно?
— Мы тут такіх не любім.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1490.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 красавіка 2018 года.